*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

**Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна**

№ 4 (282) | Субота, 2 лютага 1957 года | Цана 20 кап.



*Марыя Васільчанка—студэнтка геолага-геаграфічнага факультэта. Часта яе можна бачыць у кабінеце палітэканоміі. Тут дзяўчына чытае літаратуру, канспектуе творы класікаў марксізма-ленінізма. І не выпадкова на семінары яна прыходзіла падрыхтаванай, з вялікім запасам ведаў.*

*У гэтую сесію Марыя здае чатыры экзамены. Зараз яна настойліва рыхтуецца да чарговага экзамена.*

*Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.*

## ВЫНІК ДОБРАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

Шмат падстаў было для хвалявання у студэнтаў II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры перад экзаменам па сучаснай беларускай мове. Ды хіба-ж не будзеш хвалявацца, калі здаеш экзамен па прадмету, які праз некаторы час будзеш выкладаць у школе? Вывучэнне прадмета ускладнялася яшчэ і тым, што падручніка па яму няма. Амаль адзіным дапаможнікам з'яўляўся канспект лекцый К. І. Шапялевіча. І на экзамене выявілася, што той, хто рэгулярна хадзіў на лекцыі і старанна іх канспектаваў, адказваў на «выдатна». Цікавымі і змястоўнымі былі адказы Аліны Адамік, Ліды Гапонавай, Іны Жураўскай, Хвядоса Майсейшына, Зіны Макарэвіч, Аляксея Пекарскага і многіх другіх.

Увагу выкладчыка звярнулі на сябе адказы нашых польскіх сяброў Н. Мукасей, Л. Філіпік, В. Паулоўскай, Ш. Раманьчука, якія выкарыстalі ў сваіх адказах матэрыялы польскай мовы. Пры гэтым, адказвалі яны на чыстай беларускай літаратурнай мове.

Экзамен прайшоў добра і з'явіўся сведчаннем выдатнай падрыхтоўкі будучых выкладчыкаў беларускай мовы. Семнаццаць выдатных адзнак у першай групе і ніводнай здавальняючай на курсе—добры вынік! Экзаменатар А. І. Наркевіч і асістэнт Л. М. Шакун засталіся задаволенымі добрымі ведамі студэнтаў.

**В. БЕЧЫК,**
**У. АСІЕВІЧ.**

## Здаюць пяцікурснікі

Студэнты V курса глебавага аддзялення здавалі экзамен па гістарычнаму матэрыялізму.

У бягучым навучальным годзе да студэнтаў былі прад'яўлены больш высокія патрабаванні у параўнанні з мінулымі сесіямі. Але пяцікурснікі з гонарам вытрымалі гэты экзамен.

Большасць студэнтаў паказалі глыбокае і трывалае веданне важнейшых палажэнняў гістарычнага матэрыялізма. Такімі з'яўляюцца Кардаш, Хох, Раманенка, Яновіч, Рахуба, Пучкарова, Петух, Вайцэховіч, Высоцкая, Дуброўскі.

Трэба звярнуць увагу некаторых студэнтаў на няправільныя адносіны да адзнакі «здавальняюча». Калі выкладчык аб'ектыўна ацэньвае адказ адзнакай «здавальняюча», то некаторыя таварышы праяўляюць незадаволенасць, выказваюць крыўду, заяўляючы: «Няўжо я нічога не ведаю?».

Адзнака «здвальняюча» не азначае, што студэнт зусім не ведае прадмета. Трэба прама сказаць, што тыя таварышы, веды якіх былі ацэнены «здавальняюча», ведаюць праграмны матэрыял, патрэбныя творы, але адказваюць не дакладана, не вылучаюць галоўныя бакі пытання, недастаткова канкрэтна выкладаюць змест твора па таму або іншаму пытанню.

Асабліва хочацца сказаць аб т. Васільевай. Яна недастаткова глыбока засвоіла курс гістарычнага матэрыялізма, у яе маюцца сур'ёзныя прабелы па асобных тэмах, як гэта выявілася на экзамене.

**А. І. ЛЕЎКО,**
**кандыдат філасофскіх навук.**
**(Насценгазета «За мічурынскую біялогію».)**



*Экзамен па тэорыі і практыцы партыйнага і савецкага друку на III курсе аддзялення журналістыкі прымаюць дацэнт М. С. Зярніцкі і выкладчык В. І. Дубовік. Адказвае студэнтка Т. Арлова.*

*Фота П. БЕРАЖКОВА*

## ПЕРШЫ КРОК

Студэнты I курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры 27 і 28 студзеня здавалі першы універсітэцкі экзамен па асновах літаратуразнаўства. Першы крок, вядома, заўсёды цяжкі. Але ён паказаў, што студэнты умеюць падпарадкоўваць цяжкасці сваёй волі і мэце. Адказы пераважнай большасці студэнтаў былі грунтоўнымі па зместу і яснымі па форме. У сувязі з гэтым цяжка назваць студэнтаў, якія найбольш вылучыліся сваімі ведамі. Дастаткова адзначыць, што «выдатна» і «добра» атрымалі каля 96 працэнтаў усёй колькасці студэнтаў. Гэта і ёсць вынік сістэматычнай падрыхтоўкі да практычных заняткаў па прадмету, наведвання лекцый і працы пад кнігай.

Але нягледзячы на агульны бадзёры тон адказаў ёсць студэнты, якія не сур'ёзна аднесліся да экзаменаў. І як вынік, здавальняючыя адзнакі атрымалі Мазанік, Малая, Санько, Сенкевіч, Садоўнічы, а дрэнныя—Лях і Васілеўская.

## ЗРОБЛЕН УПЭЎНЕНА

Увогуле экзамен па літаратуразнаўству пакідае прыемнае ўражанне.

Наперадзе яшчэ упартая, цяжкая праца—вучоба. Трэба не зніжаць тэмпаў, а павышаць іх. Толькі так можна авалодаць сваёй прафесіяй і стаць карысным свайму народу. Першы экзамен паказаў, што студэнты з гэтай задачай спраўяцца.

**В. С. КАРАБАН,**
**старшы выкладчык.**

# ІДЭАЛАГІЧНУЮ РАБОТУ—
## на ўзровень сучасных патрабаванняў

**Ф. БАРАВІК**
**намеснік сакратара партыйнага камітэта**

Гістарычныя рашэнні XX з'езда КПСС у вялікай меры актывізавалі народныя масы і развязалі іх ініцыятыву ва усіх галінах нашага жыцця. Яны натхняюць наш народ на новыя працоўныя подзвігі, яшчэ шчыльней згуртавалі працоўных вакол партыі комуністаў і савецкага урада. Гэтыя рашэнні знайшлі поўную падтрымку і адабрэнне у сусветным комуністычным руху і садзейнічаюць далейшаму умацаванню і згуртаванасці сіл соцыялізма і дэмакратыі.

Поспехі краін лагера дэмакратыі і соцыялізма выклікаюць новы прыступ шаленства ў стане яго ворагаў. Сілы міжнароднага імперыялізма разгарнулі зараз жорсткую бойку супроць сіл соцыялізма і яго ідэй. Яны арганізоўваюць брудны паклёпніцкі крыжовы паход супроць соцыялістычнай ідэалогіі, супроць соцыялістычных краін. Распаўсюджванне хлуслівых чутак, паклёп, правакацыі і г. д.—вось іх метады. Агенты імперыялізма не выступаюць зараз адкрыта. Яны не заклікаюць прама да аднаўлення капіталізма. Яны ведаюць, што народы краін соцыялізма не пацерпяць гэтага. Таму агентура імперыялізма падрабляецца пад соцыялізм, змагаецца нібыта за нейкі «палепшаны» соцыялізм і дае парады, як яго «палепшыць».

Наша задача састаіць у тым, каб узмацніць палітычнае выхаванне студэнтаў. Асноўны састаў студэнтаў нашага універсітэта—гэта выпускнікі сярэдніх школ, якія недастаткова ведаюць жыццё, не пераадольвалі ніякіх цяжкасцей і таму робяць нярэдка памылковыя вывады з сучасных падзей. Не дзіўна, што студэнты не заўсёды могуць адчуць варожы нам дух у тых або іншых парадах «паляпшэння» соцыялізма і даць іх носьбітам рашучы адпор. Адсюль задача старэйшых таварышаў—і перш за ўсё выкладчыкаў—дапамагчы студэнтам разабрацца ва ўсіх вострых пытаннях, пастаўленых жыццём. Для гэтага трэба павысіць выхаваўчую ролю вучэбнага працэсу. Усе навукі, якія вывучаюцца будучымі спецыялістамі, фармуюць матэрыялістычны, марксісцкі светапогляд нашых студэнтаў. Наша задача—павысіць выхаваўчае значэнне лекцый і практычных заняткаў па ўсіх вывучаемых навуках.

Выхаваўчую работу ва універсітэце можна узняць, калі гэтым пытаннем будуць займацца не толькі грамадскія арганізацыі, але і увесь педагагічны калектыў без выключэння. Вялікая работа у гэтым кірунку прароблена у партыйнай арганізацыі філалагічнага факультэта. Тут асаблівая ўвага выкладчыкаў звернута на паляпшэнне выхаваўчай работы у інтэрнаце. Студком корпуса «А» папоўнен нядаўна найбольш актыўнымі студэнтамі, здольнымі арганізаваць парадак і адпачынак моладзі. Намечаны канкрэтныя мерапрыемствы. У дапамогу студкому замацаваны выкладчыкі т.т. Паіна, Каванава, Ерэсь. Усё гэта не магло не даць станоўчых вынікаў. Студком пачаў непасрэдна займацца выхаваўчай работай.

Вось некалькі прыкладаў. У ленпакоі інтэрната зараз праводзіцца чытка кнігі «За здаровы быт», якая потым будзе абмяркоўвацца. Не так даўно, студком на сваім пасяджэнні разбіраў амаральныя ўчынкі асобных студэнтаў. На гэтым пасяджэнні прысутнічалі сакратар партыйнага бюро факультэта Д. Е. Фактаровіч і камендант інтэрната Давыдоўскі.

У групах факультэта абмяркоўвалася пісьмо рабочага-ветэрана т. Собалева да студэнтаў, якое было надрукавана ў газеце «Труд». З дапамогай выкладчыкаў тт. Багровай, Касоўскага, Лапідуса студэнты на аснове вынікаў экзаменацыйнай сесіі рыхтуюць адказ на гэтае пісьмо.

Многа і іншых карысных мерапрыемстваў праводзіцца на факультэце.

На гістарычным факультэце праведзен сход маладых комуністаў, на якім было многа сказана аб недастатковай іх рабоце па ідэйна-палітычнаму выхаванню студэнтаў.

Канкрэтныя мерапрыемствы праходзяць зараз і на іншых факультэтах.

Асаблівая роля у фармаванні светапогляду належыць вывучэнню грамадскіх навук. І задача выкладчыкаў састаіць у тым, каб пры вывучэнні палітэканоміі, філасофіі і гісторыі КПСС дабівацца ад студэнтаў не завучвання тых або іншых палажэнняў, а вучыць іх уменню з пазіцый марксізма-ленінізма аналізаваць падзеі сучаснасці.

Побач з узмацненнем работы у групах, неабходна больш шырока практыкаваць такія формы, як арганізацыя лекцый і дакладаў па актуальных, цікавячых студэнтаў тэмах, актывізацыя студэнцкіх навуковых гурткоў, развіццё спорту, пашырэнне дзейнасці калектываў мастацкай самадзейнасці.

Хочацца сказаць і яшчэ аб адным важным пытанні. У апошнія гады прыкметна узмацнілася садружнасць навукі з вытворчасцю. Навуковыя работнікі распрацоўваюць разам з калектывамі прадпрыемстваў рознастайныя праблемы, важнасць якіх дыктуецца запатрабаваннямі вытворчасці. А вось студэнцтва не прыцягваецца да гэтай работы. А чаму-б не накіроўваць і студэнтаў на прадпрыемствы?

Кантакт студэнтаў з рабочымі, калгаснікамі мае вялікае выхаваўчае значэнне. Гэта добра разумеюць нашы комсамольскія работнікі і, у прыватнасці, сакратар камітэта комсамола т. Бабосаў. На словах ён стаіць за працоўнае выхаванне студэнтаў, але, нажаль, справа далей слоў не ідзе.

Наша задача састаіць у тым. каб выхаваць комсамольскую і студэнцкую моладзь у духу сумленных адносін да вучобы і працы, правільных паводзін у быту, клапатліва дапамагаць ёй стаць перакананымі барацьбітамі за комунізм.



*У вучэбным корпусе хімічнага факультэта ёсць два маленькіх пакоі, дзе бываюць толькі пяцікурснікі. Тут яны рыхтуюць дыпломныя работы.*

*Вось і зараз нястомна працуюць над прыгатаваннем петраграфічных шліфовак Іосіф Кузняцоў і Васіль Хрэнаў, выпускнікі аддзялення геалогіі.*

